# ШКОЛЬНАЯ ПЛАНЕТА

**НЕ БУДЗЬ ЧУЖЫНЦАМ НА СВАЁЙ ПЛАНЕЦЕ!**

***№ 5 (70) СТУДЗЕНЬ 2021***

Выданне ДУА “Сярэдняя школа № 2 г. Беразіно”

## *Сёння ў выпуску:*

2021

ГОД НАРОДНАГА АДЗІНСТВА


ГЛАВНОЕ УПРАВЛЕНИЕ
ПО ОБРАЗОВАНИЮ
МИНСКОГО ОБЛАСТНОГО
ИСПОЛНИТЕЛЬНОГО КОМИТЕТА

ДИПЛОМ

ВТОРОЙ СТЕПЕНИ

НАГРАЖДАЕТСЯ

*Радкевич*
*Никита Александрович,*
*учащийся X класса*
*государственного учреждения образования*
*«Средняя школа № 2 г. Березино»,*
*победитель третьего этапа*
*республиканской олимпиады*
*по учебному предмету «Информатика»*

Начальник
главного управления Н.Н. Башко
*14 января 2021 года*






***МІКІТА РАДКЕВІЧ – УЛАДАЛЬНІК ДЫПЛОМА II СТУПЕНІ III ЭТАПА РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ ПА ВУЧЭБНЫМ ПРАДМЕЦЕ “ІНФАРМАТЫКА”***

***ПЕДАГОГІ НАШАЙ УСТАНОВЫ АДУКАЦЫІ ПРЫНЯЛІ ЎДЗЕЛ У СПАРТАКІЯДЗЕ "БУРЕВЕСТНИК" У В. ЖОРНАЎКА***




# 5

2021

# ГОД НАРОДНАГА АДЗІНСТВА



**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусі А.Р.Лукашэнка падпісаў указ «Аб аб’яўленні 2021 года Годам народнага адзінства». Рашэнне прынята для кансалідацыі грамадства, з’яднання беларускага народа на аснове ідэй суверэнітэту і незалежнасці краіны.**

Рашэнне аб'явіць 2021 год Годам народнага адзінства прадыктавана жыццесцвярджальнай сілай культурнай спадчыны і філасофскім асэнсаваннем сённяшняга этапу развіцця краіны. Патрыятызм, культурныя каштоўнасці, духоўныя і маральныя ідэалы з'яўляюцца асноватворнымі паняццямі адзінства народа. Беларусь заўсёды славілася традыцыяй добрых, паважлівых адносін паміж людзьмі розных нацыянальнасцей і веравызнанняў.

Народнае адзінства – гэта ключавая ўмова захавання незалежнасці краіны, беражлівых адносін да гістарычнай спадчыны і прымнажэння ўсяго лепшага, што было зроблена беларусамі.




# Мікіта Радкевіч стаў уладальнікам Дыплома II ступені III этапа рэспубліканскай алімпіяды па вучэбным прадмеце “Інфарматыка”

## *Экспрэс-апытанне ганаровага прызёра:*

**Твой дэвіз.**
Прыйшоў. Убачыў. Перамог.

**Якое пачуццё з'яўляецца для цябе каштоўным у жыцці.**
Справядлівасць

**Любімы колер.**
Чорны.

**Тваё захапленне.**
Праграмаванне.

**Твой сакрэт поспеху.**
Сакрэт на тое і сакрэт.

**Шчасце…**
гэта вельмі прыемнае пачуццё

**Калі б ты сустрэў іншапланетную істоту, што ў першую чаргу раскажаў пра нашу планету?**
Я наадварот распытаў бы іншапланецян пра тое, як яны жывуць.

**Што падабаецца больш кіно ці музыка?**
Музыка.

**Любімая страва.**
Лазанья.

**Самае яркае ўражанне з маленства?**
Калі мой аднакаласнік галавой разбіў шкло ў шафе.

**Любімая пара года.**
Лета, таму што пануе сонечнае надвор'е.

**Што ты змяніў у сучаснай школе, сістэме адукацыі.**
Я б хацеў даць больш свабоднага часу дзецям.

**Любімае месца ў Беразіно.**
Бярэзінскі мост.
З яго адкрываецца прыгожы краявід на раку.

**Школа будучага. Якой яна будзе?**
З'явяцца новыя прадметы, некаторыя сыдуць у нябыт.

**Твае пажаданні чытачам нашай газеты.**
Жадаю шчасця і здароўя!

*Дзякуем за ўдзел у апытанні.*
*Жадаем далейшых поспехаў, новых перамог, шчаслівага лёсу!*

# Катанне на цюбінгах. Правілы бяспекі

У апошнія гады вялікую папулярнасць набылі надзіманыя санкі. Катанне на іх - гэта адпачынак, які аднолькава падыходзіць дарослым і дзецям. Але, на жаль, катанне на цюбінгах - гэта адзін і з самых траўманебяспечных відаў адпачынку. У адрозненне ад звычайных санак «ватрушкі» здольныя развіваць вялікую хуткасць і нават закручвацца вакол сваёй восі ў час спуску. Пры гэтым яны абсалютна некіраваны і не абсталяваны тармазной прыладай.



## Правілы бяспекі пры катанні на цюбінгах

1. Катацца толькі на спецыяльна падрыхтаваных трасах са снежнай паверхняй.
2. Схіл для катання павінен быць з ухілам не больш за 20 градусаў. Унізе схіл павінен быць прыдатным для тармажэння. Не варта катацца на цюбінгах па схілах, якія параслі дрэвамі.
3. Нельга катацца з горак з трамплінамі, пры прызямленні яна моцна спружыніць.
4. Перш чым пачаць спуск па непадрыхтаванай трасе, агледзьце, ці няма там ям, камянёў, кустоў, агароджаў і ўсяго таго, што можа прадстаўляць небяспеку для жыцця і здароўя.
5. Выконвайце дыстанцыю паміж спускамі па схіле. пачынаць рух на цюбінгах зверху дазваляецца толькі тады, калі папярэдні наведвальнік на цюбінгах скончыць спуск !!!
6. Катацца на санках-ватрушках варта седзячы. Не спрабуйце катацца на цюбінгах стоячы або скачучы, як на батуце.

## Якія траўмы часцей за ўсё атрымліваюць пры катанні на цюбінгах?

Калі чалавек губляе арыенцір, у яго парушаецца каардынацыя і ўзнікаюць высокаамплітудныя рухі ў суставах. Адсюль траўмы верхніх канечнасцяў і шыі, калі адбываецца рэзкі рывок галавы, акрамя таго, можна атрымаць пералом хрыбетніка, сатрасенне мозгу, пераломы канечнасцяў, пералом касцей таза, прычым такія, што часам патрабуюць аператыўнага лячэння.



*!!! Найбольш частыя траўмы, якія атрымліваюць на ватрушках, патрабуюць шпіталізацыі*

**Паклапаціцеся пра сваю бяспеку!**

# КАЛЯНДАР ЗНАМЯНАЛЬНЫХ ДАТ І ПАДЗЕЙ

## СТУДЗЕНЬ

1 - 160 гадоў з дня нараджэння Яўхіма Карскага (1861-1931), этнографа, фалькларыста,

11 - Міжнародны дзень «Дзякуй»



**12 - 80 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Мулявіна (1941-2003), народнага артыста Беларусі і СССР**

12 - 145 гадоў з дня нараджэння Джэка Лондана (1876-1916), амерыканскага пісьменніка

15 - 130 гадоў з дня нараджэння Восіпа Мандэльштама (1891-1938), рускага паэта

21 – Міжнародны дзень абдымкаў

25 – Дзень студэнтаў (Таццянін дзень)



**27 - 195 гадоў з дня нараджэння Міхаіла Салтыкова -Шчадрына (1826-1889), рускага пісьменніка**

27 - Міжнародны дзень памяці ахвяр Халакоста /ААН/

29 - 155 гадоў з дня нараджэння Рамэна Ралана (1866-1944), французскага пісьменніка, Нобелеўскага лаўрэата



**30 - 100 гадоў з дня нараджэння Івана Шамякіна (1921-2004), народнага пісьменніка Беларусі**

## ЛЮТЫ

2 - Дзень водна-балотных абшараў



**4 – 275 гадоў з дня нараджэння Тадэвуша Касцюшкі (1746-1817), палітычнага і ваеннага дзеяча Рэчы Паспалітай, кіраўніка нацыянальна-вызваленчага паўстання 1794 г.**

**8 - 100 гадоў з дня нараджэння Івана Мележа (1921-1976), народнага пісьменніка Беларусі**



14 - Дзень усіх закаханых (Дзень Святога Валянцiна)

14 - Міжнародны дзень дарэння кніг

15 - Дзень памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў

21 - Міжнародны дзень роднай мовы /ЮНЕСКА/

23 - Дзень абаронцаў Айчыны і Узброеных сіл Рэспублікі Беларусь



**25 - 180 гадоў з дня нараджэння П'ера Агюста Рэнуара (1841-1919), французскага мастака**

# САМАЕ ЦІКАВАЕ І АДМЕТНАЕ З ЖЫЦЦЯ ШКОЛЫ
# АДНЫМ РАДКОМ + ФОТАРЭПАРТАЖ

**Педагогі нашай установы адукацыі прынялі ўдзел у спартакіядзе "Буревестник" у в. Жорнаўка**




**АДНЫМ РАДКОМ**







**Прафарыентацыйная сустрэча навучэнцаў 11-х класаў і выкладчыкаў Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі**



**АДНЫМ РАДКОМ**

**У перыяд моцных снегападаў у рамках акцыі “Антыцыклон” вучні 9 “Б” класа аказваюць дапамогу па ўборцы дваровай і прылеглай да дома тэрыторыі ветэрана Вялікай Айчыннай вайны С.П.Стасевіч, якая не раз дзякавала рабят за аказаную ўвагу і дапамогу.**





**28 студзеня прайшлі мерапрыемствы ў рамках праекта “ШАГ” для навучэнцаў 8-11 класаў на тэму “Беларуская навука: у нагу з часам”.**



Школа
Активного
Гражданина





# АДНЫМ РАДКОМ





**Зімовыя забавы на свежым паветры, альбо несумная субота для ўсіх жадаючых**



**Лабараторыя поспеху «Славутыя земလякі. Мікалай Барысевіч – акадэмік з душой скрыпкі» і наведванне мінівыставы навуковай літаратуры беларускіх вучоных з дароўчымі надпісамі**



ДУА “Сярэдняя школа №2 г. Беразіно” 223311
вул. Мультана, 19
Электронная пошта
berezinosch2.edu@tut.by

Сайт школы
berezino2.school.by

Газета “Школьная планета” выходзіць адзін раз у месяц.
Над выпускам працавалі ўдзельнікі клуба “Юны журналіст”:
Бурая Анастасія, Верас Анастасія, Губчэўская Кацярына, Камароўская Ксенія і інш.
Кіраўнік клуба А.Я.Жданові